ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ___ Г.У. Шугала
18.03.2019

**ПЛАН РАБОТЫ ДЗІЦЯЧАГА ЧАСОВАГА АБ’ЯДНАННЯ – ЛАГЕРА “ЗДАРАВЯЧОК” З 25.03.2019 г. ПА 30.03. 2019 г. (6 каляндарных дзён) ДУА “ТУРЭЦКІ ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНЫ КОМПЛЕКС ДЗІЦЯЧЫ САД-СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА”**

УЗГОДНЕНА
Начальнік упраўлення адукацыі
Карэліцкага райвыканкама
_______ І.В. Асташэвіч

## Раздзел 1.Справаздача аб рабоце прышкольнага аздараўленчага лагера “Вясновыя здаравячкі”. ДУА “Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа” (2018 год)

У прышкольным лагеры “Вясновыя здаравячкі” адпачывала 16 навучэнцаў з 1, 2, 3, 4 класаў. Работа лагера планавалася па прынцыпу нядзельнай гульні пад агульнай назвай “Таямніцы вясновай краіны”.

Асноўныя задачы і прыярытэты работы лагернай змены:

- грамадзянска-патрыятычнае выхаванне;
- фарміраванне духоўна-маральных каштоўнасцей, навыкаў здаровага ладу жыцця ў малодшых школьнікаў;
- актыўнае прыцягненне дзяцей у сацыяльна-значымую і культурна- досугавую дзейнасць;
- фарміраванне навыкаў самадысцыпліны, культуры паводзін у малодшых школьнікаў;
- прафілактыка супрацьпраўных паводзін

За час работы лагернай змены праведзены дзве экскурсіі па вывучэнню гісторыі, акружаючага асяроддзя свайго рэгіёна: “Новая выстава ў Мірскім замку”, “Знаёмы і незнаёмы аграгарадок”, “Таямніцы вясновага лесу”. Вучні мелі магчымасць падрабязна пазнаёміцца з цікавымі мясцінамі аграгарадка і рэгіёна, наведаць выставу вeeраў у Мірскім замку.

Мерапыемствы, якія праводзіліся ў лагеры, садзейнічалі ўзбагачэнню каштоўнаснага свету дзіцяці, спрыялі развіццю маральнага вопыту і пазітыўнага погляду на жыццё. Гэта такія мерапрыемствы, як актыўная гутарка “Наш рэжым дня”, конкурс чараўнікоў “Парад вясновых прыгод”, конкурс малюнкаў “Здаровы я – здаровая мая краіна”, спартыўнае свята “Прыгоды аднаго дня”, творчая віктарына “Па запаведных сцяжынках здароўя”, і інш.

Адной з задач выхавацеляў пры складанні плана выхаваўчай работы ў лагеры было ўмела суаднесці інавацыйныя і традыцыйныя формы досугавай дзейнасці. Вядучым відам дзейнасці была гульня. На працягу работы лагернай змены выкарыстоўваліся такія формы работы, як гульнёвыя і пазнаваўчыя праграмы, экалагічныя прагулкі, ролевыя гульні, трэнінгі.

Фарміраванне здаровага ладу жыцця заставалася важнейшай часткай выхаваўчай работы па захаванню і замацаванню фізічнага, псіхічнага і маральнага здароўя малодшых школьнікаў. У час работы лагернай змены прыярытэт аддаваўся стварэнню здароўезберагаючага асяроддзя, накіраванага на фарміраванне адказных адносін да свайго здароўя і здароўя другіх як важнейшай каштоўнасці. Праца па фарміраванні здаровага ладу жыцця ўключала ў сабе асветніцкую дзейнасць ( гутаркі, інтэрактыўныя трэнінгі, выпуск газет і лістовак, правядзенне акцыі), фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы (спартландыі, спартыўныя спаборніцтвы і святы), культурна-досугавую дзейнасць, якая дапамагла раскрыць творчыя здольнасці дзяцей.

Ужо ў першыя дні прабывання дзяцей у лагеры быў складзены медыцынскі пашпарт дзіцяці з мэтай распрацоўкі далейшых перспектыў ўзаемадзеяння з дадзеным дзіцем, а іменна: вызначэнне групы здароўя, індывідуальнае кансультаванне медыцынскіх работнікаў, забеспячэнне неабходных інфармацыйных сувязей з бацькамі.

Як вядома, хваробу лепш папярэдзіць, чым лячыць. У лагеры з'яўлялася абавязковым правядзенне работы па папярэджанню дзіцячага траўматызму і прафілактыцы захворванняў. Усё гэта рэалізоўвалася па наступных напрамках:

- акцэнтуацыя прыярытэтаў здаровага ладу жыцця;
- арганізацыя гульнёвых методык : «Сцяжынка небяспечных месц», «Правілы здороўя», «Каб не здарылася бяды» і г.д..
- сустрэча рабят з медыцынскімі работнікамі амбулаторыі, арганізацыя тэматычных гутарак.

**Педагагічныя вывады.**

У выніку дзейнасці лагернай змены педагагічны калектыў вырашаў задачы па наступных прыярытэтных напрамках:

- стварэнне здароўезберагаючага асяроддзя, накіраванага на фарміраванне адказных адносін да свайго здароўя і здароўя другіх, як вышэйшай каштоўнасці;
- творчае і інтэлектуальнае развіццё вучняў шляхам правядзення розных мерапрыемстваў;
- адказныя адносіны пры правядзенні мерапрыемстваў да максімальнай бяспекі дзяцей;
- распрацоўка сістэмы аздараўленчай дзейнасці ў рэжыме дня;

**Прыярытэты работы лагера на будучае:**

- пошук магчымасцей для правядзення ў час работы лагернай змены экскурсій як па свайму рэгіёну, так і за межы раёна, вобласці;
- удасканаленне дыягностыкі і аналітычнай дзейнасці ў выхаваўчай прасторы лагера;
- пашырэнне супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі прадстаўнікамі соцыума, прыцягненне бацькоў для больш эфектыўнага правядзення мерапрыемстваў у час работы лагернай змены.

Начальнік лагера «Вясновыя здаравячкі» Гарох Т.В.

**Раздзел 2. Абгрунтаванне агульных падыходаў, якія ляжаць у аснове выхаваўчай сістэмы лагера “Здаравячок”.**

Забяспечваючы працэс арганізацыі аздараўлення і адпачынку дзяцей у летні перыяд, кіруемся нарматыўнымі прававымі актамі, якія рэгулірууюць дзейнасць выхаваўча-аздараўленчых устаноў адукацыі і пытанні аздараўлення дзяцей, указаннымі ў метадычных рэкамендацыях, размешчаных на афіцыйных крыніцах.

Асноўная задача педагагічнага калектыву – стварыць умовы для замацавання здароўя, фарміравання імкнення займацца цікавымі і карыснымі справамі.

У час гутаркі з малодшымі школьнікамі і іх бацькамі было вызначана іх жаданне бачыць работу лагера ва ўстанове адукацыі як стварэнне прасторы для аздараўлення, развіцця мастацкай, тэхнічнай, сацыяльнай творчасці дзіцяці.

У аснову дзейнасці лагера мы палажылі ідэю творчай, групавой і калектыўнай дзейнасці, заснаванай на развіцці ініцыятывы выхаванцаў, іх інтэлектуальных і творчых магчымасцях.

У аздараўленчым лагеры зыходным для нас стала палажэнне аб тым, што канікулы – вольны ад вучобы перыяд жыццядзейнасці – гэта асабісты час дзіцяці, якім ён мае права распараджацца па свайму меркаванню, а яго змест і арганізацыя – актуальная жыццёвая праблема асобы дзіцяці, у вырашэнні якой абавязкова патрэбна дапамога дарослых.

Плануючы работу, абавязкова ўлічвалі ўзроставыя асаблівасці дзяцей ў перыяд з 6 да 10 гадоў, менавіта, іх імкненне быць падобнымі на дарослых, актыўна ўступаць у зносіны з аднагодкамі; вялікая рухальная актыўнасць, ярка выражанае імкненне да спаборніцтва і гульні.

Рэжым дня дапускае абавязковае прабыванне дзяцей на свежым паветры, шырокае правядзенне спартыўных аздараўленчых мерапрыемстваў, арганізацыю рухомых гульняў, і інш.

Разам з тым пры планаванні работы лагера ўлічваўся стан здароўя кожнага дзіцяці. Дзецям на працягу лагернага дня будзе абавязкова адведзены свабодны час для заняткаў відамі дзейнасці, якія найбольш цікавяць кожнага з іх ( прачытванне мастацкіх твораў, маляванне, вольны адпачынак, і інш.)

Галоўнае для педагагічнага калектыва – даць магчымасць кожнаму дзіцяці адчуць сваю значымасць у калектыве, паспрабаваць сябе ў розных карысных справах, а яшчэ фарміраваць у сабе праз гульню ўменне паважаць акружаючых, прыслухоўвацца да думак іншых, вучыцца суперажываць акружаючым.

**Мэта работы зімовай лагернай змены:** стварыць аптымальныя ўмовы, якія забяспечаць паўнацэнны адпачынак, захаванне бяспекі жыцця дзяцей, іх аздараўленне і творчае развіццё.

**Задачы:**

- забеспячэнне адзінства працэсаў захавання і замацавання здароўя дзяцей, іх творчага і інтэлектуальнага развіцця;
- прымяненне ў рабоце лагернай змены інавацыйных форм і метадаў аздараўлення і творчага развіцця дзяцей;
- стварэнне ўмоў для праяўлення індывідуальнасці кожнага дзіцяці, яго творчага патэнцыялу;
- удасканаленне рэсурснага забеспячэння дзейнасці лагернай змены

**Раздзел 3. План работы часовага дзіцячага аб'яднання – лагера "Здаравячок"**
**ДУА " Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа"**

| Раніца | Першая палова дня | Другая палова дня |
|---|---|---|
| 25.03.2019г. Дзень 1-шы: «Узнёслае царства казкі і дабра" | | |
| 1.Пачатак вясновай адысеі " Краіна здароўя і эстэтычнай прыгажосці".<br>2. Правядзенне інструктажу для рабят "Аб правілах паводзін у сонечнай вясновай краіне" | Адкрыццё лагернай змены "Чарадзейная сустрэча з вясновай феяй"<br>Музейны урок "Знакамітыя людзі Гродзеншчыны" (у рамках святкавання 75-годдзя Гродзенскай вобласці) | "Як добра, што мы ўсе разам сустрэліся" |
| 26.03.2019 г. Дзень другі «Падарожжа ў вясновую краіну"» | | |
| Сустрэча сяброў і запрашэнне іх у казку. | Конкурс чараўнікоў "Парад вясновых прыгод "<br>Экскурсія "Ад помніка да помніка" (у рамках святкавання 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў" | Час творчасці "Я малюю " |
| 27.03.2019г. Дзень трэці. "У душы кожнага маленькага здаравячка жыве захапленне вандроўкай па родным краі". Дзень экскурсій і паходаў. | | |
| "Заглянем на хвілінку ў госці да дзядка Вандравічка". (інструкцыя па тэхніцы бяспекі ў час экскурсіі) | Паход "Захапленне прыродай роднага краю" (у рамках Года малой радзімы) | Творчая сустрэча-канферэнцыя "Справаздача аб паходзе ў апавяданнях і казках" |
| 28. 03. 2019 г. Дзень чацвёрты "У гасцях у Спартыўнай краіне" | | |
| Фізкультурная размінка | Спартландыя "З гонарам за нашу родную зямлю" (у рамках святкавання 75-годдзя Гродзенскай | Творчая віктарына "Па запаведных сцяжынках здароўя" ( на базе Турэцкага |

| | | |
|---|---|---|
| | вобласці) | ЦСДК) |
| 29.03. 2019 г. Дзень пяты “Інтэлектуальнае падарожжа” | | |
| Конкурс вясёлых выказванняў “Я здаровы – гэта значыць я вясёлы і імкнуся да новых здзяйсненняў” | Вясновая віктарына “Перамога незабыўнага мая” (у рамках святкавання 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў) | Конкурс малюнкаў “Вясенні вернісаж” |
| 30.03.2019 г. Дзень шосты “Вясновыя забавы” | | |
| Сустрэча з майстрам спартыўных спраў | Спартыўнае свята “Прыгоды аднаго дня” | Спартыўная віктарына. Закрыццё лагера “Да пабачэння, цудоўная краіна Здароўя” |

Намеснік начальніка лагера______ С.В. Ракач

**Раздзел 4. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне**

Для якаснай работы лагера створана адапаведная матэрыльна-тэхнічная база:

- Метадычная бібліятэка для педагогаў-выхавацеляў.
- Бібліятэка дзіцячай мастацкай літаратуры.
- Актавая зала, дзе праводзяцца масавыя мерапрыемствы.
- Гульнятэка, якая ўключае ў сабе разнастайныя настольныя і рухомыя гульні навучальнага і развіваючага характару, якія актыўна выкарыстоўваюцца для арганізауыі дасуга дзяцей.
- Спартыўнае абсталяванне, спартыўная зала.
- Раздатачны матэрыял: табліцы, малюнкі, фішкі для правядзення гульняў.
- Музыка, ноты, вершы.
- Фотаілюстрацыі.
- Сцэнарыі мерапрыемстваў.

**Метадычнае забеспячэнне**

- Метадычная бібліятэка для педагогаў-выхавацеляў.
- Зборнік метадычных рэкамендацый
- Адукацыйная праграма.
- Інструктыўна-метадычнае пісьмо "Аб мерах па ўдасканаленню работы выхаваўча-аздараўленчых установў адукацыі".
- Канцэпцыя дзіцячага адпачынку і аздараўлення.
- Метадычныя рэкамендацыі у дапамогу арганізатарам адпачынку.
- Педагагічны дзённік

**Кадравае забеспячэнне**

Начальнік лагера: намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Т.В. Гарох;
Намеснік дырэктара лагера – педагог-арганізатар Ракач Святлана Васільеўна;
Псіхолага-педагагічнае суправаджэнне работы змены – педагог-псіхолаг Факеева Ю.С.;
Выхавацелі: настаўнікі пачатковых класаў Лазун І.В, Самец Т.Дз.., Дземяновіч Н.В., Гунько А.А.
Кіраўнік фізічнага выхавання – настаўнік фізічнай культуры і здароўя Г.У. Дрык